Арлоўская Л.Ю., студ. гр. 413 ФТБК і СМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Еўдакіменка С.В.,
выкладчык

# ГРОДЗЕНСКІЯ ПАДВОЙНЫЯ ДЫВАНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існуе шмат версій наконт паходжання унікальнага віду падвойнага ткацтва на тэрыторыі Гродзеншчыны. Многія з вучоных бачаць іх вытокі ў краінах Скандынавіі, другія лічаць яго радзімаю Расію, а трэція мяркуюць, што крыніцаю гэтых тканін была Польшча ці тэрыторыя Заходняй Германіі. Нягледзячы на вялікую колькасць гіпотэз, справядлівым будзе адзначыць тое, што гэты від ткацтва мае вельмі даўнія вытокі развіцця.

Двухасноўныя (падвойныя) дываны можна лічыць найбольш прыкметнай з’яваю сярод мастацкіх тканін Панямоння, якія займаюць кампактную зону беларуска-польскага памежжа: крайні паўночны захад Гродзеншчыны і паўночны ўсход Польшчы (пераважна Беласточчыну). З-за вузкалакальнасці пашырэння такіх дываноў яны атрымалі ў мастацтвазнаўстве назву “гродзенскіх”. Гэтыя вырабы як па тэхналогіі выканання, так і па характары дэкору прыкметна адрозніваюцца ад мясцовых традыцыйных тканін і сведчаць пра ўплыў старажытнай высокаразвітой культуры. Гэта унікальнае мастацкае ткацтва было шырока распаўсюджана ў XIX – першай палове XX стагоддзя на тэрыторыі Мастоўскага, Бераставіцкага, Гродзенскага, Шчучынскага, Слонімскага раёнаў.

Сярод першых даследчыкаў “гродзенскіх дываноў” быў дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Юзаф Ядкоўскі (1890 – 1950), які каля дваццаці гадоў збіраў навуковы матэрыял. На жаль, рукапісы яго не захаваліся, і не ўсе вынікі даследаванняў былі надрукаваны.

Таксама дэталёвым вывучэннем гэтай унікальнай тэхнікі займаўся нямецкі прафесар Конрад Гагм, які ўказваў на вузкі раён іх распаўсюджання – Гродна – Беласток – Аўгустаў.

Гродзенскія дываны прыкметна адрозніваюцца ад іншых традыцыйных тыпова мясцовых вырабаў не толькі характэрнай тэхналогіяй і больш кантрастнай каларыстыкай, але і своеасаблівым, часам не зусім звычайным дэкорам. Кампазіцыя іх тыпова дывановая: цэнтральнае поле з акаймоўкай. У вырабах XIX – XX ст. пераважала рытмічная кампаноўка поля з аднаго – двух матываў галоўным чынам геаметрычнага ці моцна стылізаванага характару, што нагадвае дэкор мясцовых пераборных посцілак. Значна больш арыентаваны дэкор дываноў, цэнтральнае поле якіх запаўняюць буйныя матывы расліннага характару: некалькі крыжападобна размешчаных пальметаў ці разетак, сіметрычных ці асіметрычных галінак з лісцем, шышкамі і г. д. Акаймоўка складаецца з драбнейшых геаметрычных ці геаметрычна-раслінных матываў, звычайна звязаных зігзагападобнай лініяй.
Часта сустракаецца матыў дрэва жыцця, які наогул пашыраны ў беларускім народным мастацтве. Звычайна ён выглядае як сцябліна з адгалінкаваннямі, у пазнейшы час дрэва жыцця трансфаймуецца ў вазон,а таксама існуе геаметрызаваная версія дрэва жыцця ў выглядзе скрыжаваных галінак.

У падвоеным ткацтве гэты матыў мае цікавае пластычна-графічнае вырашэнне: у цэнтры – магутны ствол, што абазначае род, ад яго сіметрычна адыходзяць па 8 галін, на кожнай з іх – яшчэ па 2 маленькія дрэвы жыцця. Адно сімвалізуе бацькоўскую, другое – мацярынскую лінію роду. На кожным дрэўцы – па 6 бутонаў, кожны складаецца з 4 матываў – сімвалаў сям'і. Пучкі роўных ліній, што коса адыходзяць ад галін уніз – гэта малітва, просьба, якую выказваюць на Дзяды і на Радаўніцу духам памерлых продкаў, каб ім на тым свеце было вечнае шчасце. Птушкі накшталт пеўнікаў ці галубкоў абазначаюць ахвяраванне, якое прыносяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як памяць пра памерлых. Дзе-нідзе да галін падвешаны маленькія разеткі рознай формы і памеру – просьба маці пра вечнае шчасце памерлым дзецям.[1] Прыкладам можа быць дыван з адлюстраваннем сямейнага радаводу, створаны ў 1936 годзе на Гродзеншчыне, на якім можна заўважыць цэлую паэму пра вечнасць і неўміручасць роду і сям'і.

Своеасаблівай візітнай карткай народнага мастацкага ткацтва Панямоння можна лічыць паласатыя "пасягі" што ў аснове сваёй тэхналогіі вельмі блізкія да двухасноўных падвойных тканін.[2]

Панямонскія ткачыхі сцвярджаюць, што шматколеравыя вясёлкавыя "пасякі" і сакрэты іх стварэння яны атрымалі ў спадчыну ад сваіх матуль і бабуль, а тыя таксама ад сваіх продкаў. Адсюль вынікае, што "пасякі" на Гродзеншчыне ткуць з вельмі старажытных часоў. Але гэта ткацтва, бясспрэчна, з'яўляецца больш простым варыянтам двухасноўнага падвойнага.

Традыцыі ткацкага мастацтва шчыра шануюць ткачыхі з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна, куды мы завіталі падчас вандроўкі па Гродзеншчыне. Нас сустрэлі навуковы супрацоўнік Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея Басінская Кацярына Вітальеўна і былы супрацоўнік Белакоз Вера Ігнацеўна. Яны распавялі нам пра тое, што свае двухасноўныя падвойныя дываны ткуць проста ў пакоі музея. Гэта стваральнік і дырэктар музея Алесь Белакоз аднойчы вырашыў павялічыць калекцыю "гродзенскіх дываноў", што былі ў экспазіцыі музея, творамі сваіх землякоў. Менавіта ён накіраваў Веру Белакоз да Ядвігі Райскай навучацца падвойнаму ткацтву. А праз некаторы час Райская прыехала сама ў Гудзевічы і яшчэ падвучыла мясцовых майстрых ткацтву прыгожых тканін. Цяпер у музеі ёсць не толькі падвойныя дываны канца XIX – пач. XX ст., але і створаныя ў нашы дні. Ткуць ў Гудзевічах

[1] Кацар М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка, С. 15
[2] Ткацтва: Зб. Матэрыялаў па бел. нар. Ткацтву, С. 55

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанчыны, а побач з імі дзяўчынкі пераймаюць добрыя традыцыі ад старэйшых.

Разгледзім “гродзенскі дыван”, які быў створаны ў 1893г. і зараз знаходзіцца ў Беластоцкім акруговым музеі. Ён выткан у два колеры – светла-чырвоны і фіялетавы. На цэнтральным полі дывана - матыў вясельнага карагода, дзе фігуры людзей мяжуюцца з фігурамі птушак і жывёл, сілуэты якіх трактуюцца ў профіль, а выявы людзей - у фаз. Паміж фігурамі размешчаны матыў дрэва жыцця, а ўсё астатняе поле ўсыпана дробнымі стылізаванымі кветачкамі, нібыта зоркамі на нябёсах. Зыходзячы з усяго гэтага можна смела адзначыць тое, што гэты дыван выкарыстоўваўся пры вясельных абрадах, як важная частка пасагу маладой. Цэнтральнае поле дывана аблямоўваецца бардзюрам з увасабленнем расліннага арнаменту, які, нібыта сплецены ў вянок, цягнецца па ўсёй даўжыні бардзюра. З усіх чатырох бакоў дыван аздоблены махрамі, што надае дадатковую ўрачыстасць.

Наогул я не імкнулася да вычарпальнай характарыстыкі падвойных дываноў. Было толькі імкненне яшчэ раз дакрануцца да асобных бакоў гэтай старадаўняй тэхнікі. Народнае мастацтва вывучаецца рознымі навукамі і ўвогуле прыцягвае вялікую зацікаўленнасць сярод шырокага кола даследчыкаў ,але усё яшчэ захоўвае малавывучаныя тэмы, непадняты пласт нацыянальнай культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

**1.** Кацар М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / Навук. рэд. Я. М. Сахута – Мн. : БелЭн, 1996. – 208с. [14 - 15]

**2.** Курилович А. Н. Белорусское народное ткачество. – Мн.: Наука и техника, 1981. – 119 с., ил[87 - 92]

**3.** Лабачэўская В. А. Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі. – Мн. : Беларуская навука, 1998. – 375с., іл. [272 - 275]

**4.** Трызна Д. С. Беларускія дываны і габелены. - Мн. : Навука і тэхніка , 1981. – 127 с., іл. [23 - 26]

**5.** Па словах

**6.** Маліноўская Т. Ю.Ядкоўскі – пачынальнік стварэння калекцыі народнага мастацтва ў Гродзенскім гісторыка-краязнаўчым музеі. – У зб.: Краязнаўчыя запіскі. Зборнік памяці Юзафа Ядкоўскага. – Гродна, 1996. – С. 29-31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ